# § 17. Правы і адказнасць непаўналетніх

## Якія правы ёсць у дзяцей?

Падарунак на дзень нараджэння?



Грошы за распрацоўку мабільнага дадатку залічу на рахунак у банку?

**Малалетні (да 14)**

- Здзяйсняць дробныя бытавыя здзелкі
- Распараджацца сваімі падарункамі

**Непаўналетні (14–18)**

- Здзяйсняць дробныя бытавыя здзелкі
- Распараджацца ўласнымі даходамі
- Ажыццяўляць аўтарскія правы
- Адкрываць рахунак у банку і распараджацца ім

Я магу заключаць працоўны дагавор без згоды бацькоў?



Дзе і як я магу атрымаць абарону ад цкавання ў інтэрнэце?

- Права на жыццё
- Права на імя і на набыццё грамадзянства
- Права на ўзровень жыцця, неабходны для развіцця
- Права свабодна выказваць сваю думку
- Права на адукацыю, адпачынак і вольны час
- Права на захаванне сваёй індывідуальнасці

| 1959 г. | 1989 г. | 1993 г. |
|---|---|---|
| Дэкларацыя правоў дзіцяці | Канвенцыя аб правах дзіцяці | Закон аб правах дзіцяці ў Рэспубліцы Беларусь |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

**Паняцце правоў дзіцяці і іх абарона.** Сёння ў гэта цяжка паверыць, але яшчэ два стагоддзі таму нават у самых развітых дзяржавах не лічылася неабходным выконваць правы дзяцей. Дзяцей разглядалі як маленькіх дарослых, і часта ўжо ва ўзросце пяцішасці гадоў ім даводзілася працаваць. Так, у XIX ст. у Еўропе малалетнія дзеці працавалі на заводзе побач з дарослымі 12—14 гадзін на дзень. Часта яны выконвалі тыя работы, якія не маглі выконваць дарослыя, напрыклад бегалі паміж рухомымі часткамі ткацкага станка, збіраючы прасыпаную воўну, або поўзалі ў вузкіх хадах вугальных шахтаў. Любая памылка магла прывесці да цяжкай траўмы ці нават смерці дзіцяці.

Першыя крокі ў палягчэнні становішча дзяцей былі зроблены ў Еўропе пасля Першай сусветнай вайны. Так, у 1924 г. міжнародная арганізацыя Ліга Нацый прыняла Дэкларацыю правоў дзіцяці. Аднак у поўнай ступені абарона правоў дзяцей пачала рэалізоўвацца са стварэннем ў 1945 г. Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Ужо ў 1946 г. пачаў сваю працу Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ), першапачатковай мэтай якога была абарона пацярпелых ад вайны дзяцей у Еўропе. Неўзабаве яго дзейнасць распаўсюдзілася на ўвесь свет.

Правы дзіцяці знайшлі замацаванне ў прынятай у 1948 г. Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека. У 1959 г. была прынята асобная Дэкларацыя правоў дзіцяці. У ёй былі дэталёва прапрацаваны асноўныя бакі жыцця дзяцей, якія маюць патрэбу ў абароне. Надалей, з развіццём уяўленняў пра сацыяльную дзяржаву, змяняліся і ўяўленні аб правах дзіцяці. Стала зразумела, што яны маюць патрэбу ў больш дэталёвай рэгламентацыі. У выніку ў 1989 г. Генеральная Асамблея ААН прыняла *Канвенцыю аб правах дзіцяці.*

У БССР, адной з краін-заснавальніц ААН, правы дзяцей былі абаронены на аснове як міжнародных дакументаў, так і савецкага заканадаўства. У Рэспубліцы Беларусь закон «Аб правах дзіцяці» быў прыняты ў 1993 г.


Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У законе под *дзіцем* разумецца фізічная асоба да дасягнення ёю ўзросту 18 гадоў (паўналецця), калі паводле закону яна раней не набыла грамадзянскую дзеяздольнасць у поўным аб'ёме. Усе дзеці маюць роўныя правы незалежна ад паходжання, расавай, нацыянальнай і грамадзянскай прыналежнасці, сацыяльнага і маёмаснага становішча, полу, мовы, адукацыі, адносін да рэлігіі, месца жыхарства, стану здароўя і іншых абставін, якія тычацца дзіцяці і яго бацькоў. Роўнай і ўсебаковай абаронай дзяржавы карыстаюцца дзеці, народжаныя ў шлюбе і па-за шлюбам.

## Правы дзіцяці

- **Права на жыццё**
- **Права на ахову і ўмацаванне здароўя**
- **Права на грамадзянства**
- **Права на годны ўзровень жыцця**
- **Права на недатыкальнасць асобы, абарону ад эксплуатацыі і гвалту**
- **Права на вызначэнне адносін да рэлігіі**
- **Права на атрыманне, захаванне і распаўсюджванне інфармацыі, свабоднае выказванне думкі**



- **Права на жыццё ў сям'і**
- **Права на жыллё**
- **Права на маёмасць**
- **Права на адукацыю**
- **Права на працу**
- **Права на свабоду аб'яднанняў**
- **Права на адпачынак**
- **Права на абарону гонару і годнасці**

Згодна з законам «Аб правах дзіцяці» дзіця ва ўзросце 14 гадоў і старэйшае мае права на атрыманне юрыдычнай дапамогі для ажыццяўлення і абароны сваіх правоў і свабод, у тым ліку права карыстацца ў любы момант дапамогай адвакатаў і іншых сваіх прадстаўнікоў, у судзе, іншых дзяржаўных органах, іншых арганізацыях і ў адносінах са службовымі асобамі і грамадзянамі без згоды бацькоў або асоб, якія іх замяняюць.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

У выпадку парушэння сваіх правоў дзіця можа звяртацца з заявамі ў органы апекі і папячыцельства, пракуратуру, а пасля дасягнення 14 гадоў — у суд з заявай аб абароне сваіх правоў і інтарэсаў, а таксама ажыццяўляць абарону правоў і інтарэсаў праз сваіх законных прадстаўнікоў. У нашай краіне працуе Нацыянальная камісія па правах дзіцяці.

## Дзіця абавязана:

- **выконваць законы дзяржавы;**
- **клапаціцца пра бацькоў;**
- **паважаць правы і інтарэсы іншых грамадзян, традыцыі і культурныя каштоўнасці беларускага народа, іншых нацый і народнасцей;**
- **авалодваць ведамі і рыхтавацца да самастойнай працоўнай дзейнасці;**
- **беражліва ставіцца да навакольнага асяроддзя, усіх відаў уласнасці**

**Дзеяздольнасць і адказнасць непаўналетніх у Рэспубліцы Беларусь.** Кожны чалавек з нараджэння валодае праваздольнасцю, гэта значыць мае правы. Аднак рэалізацыя шэрагу правоў (напрыклад, права на маёмасць) на практыцы звязана з набыццём дзеяздольнасці. Калі гаворка ідзе пра дзеяздольнасць, маецца на ўвазе, што чалавек дасягнуў дастатковай псіхічнай сталасці, якая дазваляе яму разумець значэнне сваіх дзеянняў і кіраваць імі. З дасягненнем дзеяздольнасці звязана магчымасць здзяйсняць розныя юрыдычныя дзеянні (напрыклад, набыць кватэру, узяць крэдыт у банку і да т. п.). У поўным аб'ёме дзеяздольнасць набываецца з надыходам паўналецця — пры дасягненні 18-гадовага ўзросту.

Непаўналетнія таксама валодаюць пэўным аб'ёмам дзеяздольнасці. Ён залежыць ад узросту і адрозніваецца для непаўналетніх ва ўзросце да 14 гадоў (малалетніх) і непаўналетнх ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў.

Паводле агульнага правіла здзелкі за *малалетніх* здзяйсняюць ад іх імя толькі законныя прадстаўнікі — бацькі, усынавіцелі



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

або апекуны. Яны ж нясуць маёмасную адказнасць за гэтыя здзелкі. Разам з тым заканадаўства вызначае шэраг здзелак, якія непаўналетнія ва ўзросце да 14 гадоў маюць права здзяйсняць самастойна. Да іх належаць:

- дробныя бытавыя здзелкі;
- здзелкі, якія накіраваны на бязвыплатнае атрыманне выгад і не патрабуюць натарыяльнага зацвярджэння або дзяржаўнай рэгістрацыі;
- здзелкі па абыходжанні са сродкамі, выдадзенымі законным прадстаўніком або са згоды апошняга трэцяй асобай для пэўнай мэты або свабоднага распараджэння.


Дробныя бытавыя здзелкі


Бязвыплатнае атрыманне выгад


Распараджэнне сродкамі

Якія ўзроставыя абмежаванні існуюць для продажу розных тавараў?

Дробнымі бытавымі з'яўляюцца здзелкі, накіраваныя на задавальненне звычайных патрэб: набыццё прадуктаў харчавання, сшыткаў, канцылярскіх прылад, білетаў у кіно, рамонт адзення ці абутку, выраб дублікатаў ключоў, аплата катання на атракцыёне ў парку забаў і да т. п. Як правіла, гаворка ідзе пра параўнальна невялікі кошт рэчаў або паслуг.

Да здзелак, накіраваных на бязвыплатнае атрыманне выгад, адносяцца, напрыклад, атрыманне ў дар якой-небудзь маёмасці (рэчаў або грошай), часовае бязвыплатнае карыстанне маёмасцю (напрыклад, бібліятэчным фондам), іншыя выпадкі бязвыплатнага атрымання выгады (выйгрыш па латарэйным білеце, набытым малалетнім самастойна або падораным яму кімсьці). Аднак мала-



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

летні не можа самастойна атрымаць у дар маёмасць, якая павінна быць зарэгістравана (кватэру, аўтамабіль і да т. п.). Калі яму дораць такую маёмасць, то здзяйсняць здзелку (прымаць дар) будуць законныя прадстаўнікі.

Малалетнія могуць самастойна распараджацца сродкамі, выдадзенымі законным прадстаўніком або з яго згоды трэцяй асобай (напрыклад, цёткай або дзядзькам).

*Непаўналетнія ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў* ужо здзяйсняюць здзелкі самі, але з пісьмовай згоды сваіх законных прадстаўнікоў — бацькоў, усынавіцеляў або папячыцеляў. Для іх гэтак, як і для малалетніх, акрэслены шэраг здзелак, якія яны маюць права здзяйсняць самастойна. Так, непаўналетнія ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў самастойна здзяйсняюць тыя самыя здзелкі, якія могуць самастойна здзяйсняць малалетнія, і дадаткова маюць права:

- распараджацца сваімі заробкам, стыпендыяй і іншымі ўласнымі даходамі;
- ажыццяўляць правы аўтара твора навукі, літаратуры або мастацтва, вынаходства ці іншага выніку сваёй інтэлектуальнай дзейнасці, што ахоўваецца заканадаўствам;
- уносіць грашовыя сродкі ў банкі ці нябанкаўскія крэдытна-фінансавыя арганізацыі і распараджацца імі ў адпаведнасці з заканадаўствам.



Выканайце міні-праект «Рахунак у банку для непаўналетніх». Разгледзьце прапановы розных банкаў па адкрыцці рахункаў і ўнясенні грашовых сродкаў ва ўклады. Якая прапанова самая прывабная?

Па здзелках, здзейсненых самастойна, непаўналетні ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў самастойна нясе маёмасную адказнасць. Што датычыцца здзелак, здзейсненых ім з пісьмовай згоды бацькоў,



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

то па іх маёмасную адказнасць нясе сам непаўналетні, а калі яго маёмасці не хапае, тады дадатковую адказнасць нясе асоба, якая дала пісьмовую згоду на здзяйсненне адпаведнай здзелкі.

У адпаведнасці з нормамі *працоўнага заканадаўства* асоба, якая дасягнула ўзросту 16 гадоў, мае права самастойна заключаць працоўныя дагаворы. Таксама з пісьмовай згоды аднаго з бацькоў (усынавіцеляў, папячыцеляў) працоўны дагавор можа быць заключаны з асобай, якая дасягнула 14 гадоў, для выканання лёгкай працы ці заняткаў прафесійным спортам, якія не з'яўляюцца шкоднымі для яе здароўя і развіцця, не перашкаджаюць атрыманню агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Пры гэтым для непаўналетніх існуюць дадатковыя гарантыі. Так, забараняецца далучаць непаўналетніх да працы на цяжкіх работах і на работах са шкоднымі і (або) небяспечнымі ўмовамі, на падземных і горных, начных і звышурочных работах, работах у дзяржаўныя святы і святочныя дні, у выхадныя дні. Таксама ім забаронена падымаць і перасоўваць уручную цяжары, якія перавышаюць вызначаныя для іх нормы.

Для непаўналетніх работнікаў вызначаецца скарочаная працягласць працоўнага часу: ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў — не больш за 23 гадзіны на тыдзень, ад 16 да 18 гадоў — не больш за 35 гадзін на тыдзень. Навучэнцы, якія атрымліваюць агульную сярэднюю, прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную адукацыю і працуюць на працягу навучальнага года ў вольны ад вучобы час, могуць працаваць не больш за палову максімальнай працягласці працоўнага часу для свайго ўзросту. Працоўны адпачынак работнікам ва ўзросце да 18 гадоў даецца ў летні час або, па іх жаданні, у любы іншы час года.

У адпаведнасці з нормамі *сямейнага заканадаўства* шлюбны ўзрост устанаўліваецца з 18 гадоў. Аднак у выключных выпадках, абумоўленых цяжарнасцю і нараджэннем дзіцяці, ён можа быць зніжаны, але не больш чым на тры гады. Зніжэнне шлюбнага ўзросту ажыццяўляецца па заяве асоб, якія бяруць шлюб. Пры гэтым



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

згоды бацькоў, усынавіцеляў, папячыцеляў непаўналетніх на рэгістрацыю шлюбу не патрабуецца.

На жаль, паводзіны людзей у грамадстве не заўсёды бываюць правамернымі. Калі чалавек здзяйсняе ўчынкі, якія супярэчаць нормам права, то гаворка ідзе аб правапарушэнні. Усе правапарушэнні падзяляюцца на дзве групы: правіннасці і злачынствы. *Правіннасцю* называецца грамадска шкоднае дзеянне, а *злачынствам* — грамадска небяспечнае дзеянне.

**Злачынства**
Грамадска небяспечнае дзеянне

**Правіннасць**
Грамадска шкоднае дзеянне

У выпадку здзяйснення правапарушэнняў непаўналетнія падлягаюць адміністрацыйнай або крымінальнай адказнасці па дасягненні 16-гадовага ўзросту. Пры гэтым існуе шэраг адміністрацыйных правіннасцей і крымінальных злачынстваў, за здзяйсненне якіх прадугледжана адказнасць з 14-гадовага ўзросту.

?

1. Пералічыце асноўныя дакументы па правах дзіцяці. Якія правы гарантаваны гэтымі дакументамі?
2. Ці можа 15-гадовае дзіця з'яўляцца ўласнікам кватэры, атрыманай у спадчыну? Калі яно захоча здаць гэтую кватэру ў арэнду, якім чынам будзе здзяйсняцца здзелка?
3. Сістэматызуйце інфармацыю пра асаблівасці працаўладкавання непаўналетніх, склаўшы табліцу. ■

| Асаблівасці працаўладкавання непаўналетніх | |
|---|---|
| **Узрост заключэння працоўнага дагавора** | |
| **Абмежаванні ў выкананні пэўных работ** | |
| **Працоўны час і час адпачынку** | |



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

# Абагульненне па раздзеле «Асоба, грамадства, дзяржава»

1. **Дайце азначэнні наступным паняццям: грамадзянства, дзяржава, канстытуцыя, мараль, мясцовае кіраванне, мясцовае самакіраванне, Нацыянальны сход, Палата прадстаўнікоў, права, правы чалавека, Прэзідэнт, Савет Міністраў, Савет Рэспублікі, суд.**
2. **Якія асноўныя значэнні мае паняцце «права»?**
3. **Складзіце па асноўных паняццях раздзела ментальную карту, на якой адлюструйце сувязі паміж паняццямі.**
4. **Прывядзіце прыклады, як суадносяцца канстытуцыйныя правы і абавязкі чалавека і грамадзяніна.**
5. **Прачытайце тэкст. Якія характарыстыкі ў апісанні сацыяльных нормаў належаць да маральных, а якія да прававых нормаў?**

   Сацыяльныя нормы могуць быць сфармуляваны як забароны ці дазволы што-небудзь рабіць асобнаму індывіду або групе людзей (вусна ці пісьмова, фармальна ці нефармальна). Нормы таксама адрозніваюцца па тым, наколькі яны выконваюцца. Шляхам ухвалення за выкананне нормаў і пакарання за іх парушэнне грамадства ажыццяўляе сацыяльны кантроль. За парушэнне адных нормаў (напрыклад, забойства чалавека) можа быць вельмі сур'ёзнае пакаранне (доўгае турэмнае зняволенне, нават смяротная кара), за парушэнне другіх (напрыклад, адмаўленне саступіць месца ў аўтобусе пажылому чалавеку) — выказанае незадавальненне, дакорлівы погляд.
6. **Абгрунтуйце неабходнасць наступных прававых нормаў.**

   На тэрыторыі Беларусі замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства карыстаюцца правамі і свабодамі і выконваюць абавязкі нароўні з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. У той самы час шэраг правоў і абавязкаў (напрыклад, выбарчае права, абавязак служыць ва Узброеных Сілах) распаўсюджваецца выключна на грамадзян нашай дзяржавы.



Правообладатель Адукацыя і выхаванне

7. На прыкладзе канкрэтнага закона прадэманструйце ролю розных галін улады ў яго прыняцці, выкананні і кантролі за выкананнем.
8. Складзіце параўнальную табліцу «Дзеяздольнасць і адказнасць малалетніх і непаўналетніх (14—18)».
9. Сфармулюйце па два пытанні да ўступнай інфаграфікі для кожнага параграфа. Запішыце іх. Сцісла адкажыце на кожнае пытанне без інфаграфікі.
10. Пакажыце на прыкладзе прыведзеных цытат і малюнкаў узаемасувязь паміж сацыяльнымі нормамі, канстытуцыйнымі правамі чалавека, дзейнасцю заканадаўчых і выканаўчых органаў у сферы адукацыі.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь утрымлівае наступныя палажэнні:**

**Артыкул 49.** Кожны мае права на адукацыю.

Гарантуюцца даступнасць і бясплатнасць агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Сярэдняя спецыяльная і вышэйшая адукацыя даступная для ўсіх у адпаведнасці са здольнасцямі кожнага. Кожны можа на конкурснай аснове бясплатна атрымаць адпаведную адукацыю ў дзяржаўных навучальных установах.












Правообладатель Адукацыя і выхаванне